© 2021 Katedra Białorutenistyki UW. Wydanie w otwartym dostępie na licencji **CC BY-NC-ND** (https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/4.0/deed.pl)

**ACTA ALBARUTHENICA 21: 2021**
DOI: 10.32612/uw.18988091.2021.21.pp.165–175

**Анатоль Багдзевіч / Anatol Bahdzevich**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы /
Yanka Kupala State University of Grodno
ORCID: https://orcid.org/0000-0002-8101-1590
e-mail: a.bogdevich@grsu.by

# Аб магчымым уплыве грэцкай мовы на развіццё дзеепрыметнікаў залежнага стану цяперашняга часу ў славянскіх мовах

*On the Possibility of Greek Influence on the Development of Slavic Present Passive Participles*

*O możliwym wpływie języka greckiego na rozwój imiesłowu biernego czasu teraźniejszego w językach słowiańskich*

Актыўнае выкарыстанне дзеепрыметнікаў залежнага стану цяперашняга часу з суфіксамі *-ем-*, *-ім-* сярод славянскіх моў найбольш уласціва рускай мове, дзе, пачынаючы з канца XVIII стагоддзя больш запатрабаванай з'яўляецца адпаведная граматычная семантыка. Адзначым, што такая семантыка надзвычай спарадычна запатрабавана ў большасці моўных стыляў, але надзвычай пашырана ў навуковым стылі (і вытворных ад яго падстылях, напрыклад, навукова-папулярным або публіцыстычным, які сёння нярэдка мае рысы навуковага), таму функцыянаванне згаданых дзеепрыметнікаў нават на сёння, калі і не абмяжоўваецца навуковым стылем, то, ва ўсякім выпадку, падтрымка такога функцыянавання адбываецца не ў напрамку "жывая гутарковая мова → навуковая мова", а наадварот. Што ж да іншых славянскіх моў, то ўжыванне такіх дзеепрыметнікаў у беларускай і ўкраінскай мовах сустракаецца, зноў жа, пераважна ў навуковым стылі, а ў заходнеславянскіх мовах гэтыя формы можна лічыць страчанымі [Мацюсович 1976: 69; Широкова 1952: 158; Мистрик 1981: 264].

З аднаго боку, нярэдка адзначаецца, у тым ліку, навукоўцамі, якія займаюцца вывучэннем функцыянавання дзеепрыметнікаў у беларускай мове, значны семантычны патэнцыял форм залежнага стану цяперашняга часу, а таксама кампактнасць гэтых форм, што падвышае семантычны патэнцыял тэксту ў цэлым. З другога боку, на працягу

ўсяго развіцця беларускай літаратурнай мовы існавала значная пурыстычная тэндэнцыя да адмаўлення натуральнасці дадзенай формы дзеепрыметнікаў у беларускай мове і непажаданасці іх выкарыстання [Сцяцко 2002: 37–38; Багдзевіч 2000]. Разам з тым, цікава прасачыць за гісторыяй дадзенай формы ў славянскіх мовах, бо, на наш погляд, якраз гісторыя і паказвае вытокі адмаўлення форм на *-ем-*, *-ім-* у адных славянскіх мовах і іх знікнення ў іншых.

Асноўныя тэндэнцыі, якія прасочваюцца ў гісторыі дзеепрыметнікаў з суфіксамі *-ем-* і *-ім-* у славянскіх мовах можна звесці да дзвюх: з аднаго боку, паступовае затуханне, якое з рознай ступенню актыўнасці і з рознымі вынікамі можа назірацца ва ўсіх славянскіх мовах, уключаючы рускую і беларускую, з другога боку, – актывізацыя, якая назіраецца пераважна ў перыяды актыўнага развіцця кніжнасці і асабліва ў XX стагоддзі паралельна з імклівым развіццём навукі і, адпаведна, пашырэннем навуковых тэкстаў. Першая тэндэнцыя, на нашу думку, дыктуецца імкненнем носьбітаў мовы да эканоміі моўных сродкаў. На першы погляд, дзеепрыметнікі залежнага стану цяперашняга часу якраз і адпавядаюць такому імкненню, паколькі кампактна – у межах адной словаформы – перадаюць даволі складаную граматычную семантыку і падвышаюць інфармацыйны патэнцыял тэксту. На самой справе, з-за нізкай запатрабаванасці азначанай граматычнай семантыкі (‘які падпадае ўздзеянню з боку суб’екта дзеяння адначасова з іншым дзеяннем’) такая форма для большасці носьбітаў мовы з’яўляецца збыткоўнай, і наяўнасць яе не адпавядае імкненню да эканоміі моўных сродкаў. Найбольш верагодна, што такая тэндэнцыя ўзыходзіць да часоў праславянскай мовы [Супрун 1993: 78]. Другая тэндэнцыя дыктуецца ўскладненнем сэнсавага і семантычнага патэнцыялу тэкстаў у сучасным дыскурсе, прычым, не толькі навуковым, таму фармальна кампактная і семантычна ёмістая форма ў дадзеных умовах набывае пашырэнне. У стараславянскай мове, якая з’яўлялася мовай кніжнасці, прычым, фактычна не толькі на тэрыторыі паўднёвых славян, формы дзеепрыметнікаў на *-ем-*, *-ім-* былі досыць пашыраны, а многія даследчыкі славянскіх моў лічаць, што менавіта стараславянская мова і з’яўлялася крыніцай дадзеных форм для іншых славянскіх моў, якія ў той ці іншай ступені зведалі яе ўплыў на пэўных этапах станаўлення і развіцця іх літаратурных варыянтаў. Адзначым, што актывізацыя разгляданых форм у рускай мове адназначна адбывалася ў межах такога ўплыву, бо стараславянска-рускія моўныя сувязі засведчаны і гістарычна, і на падставе лінгвістычнага аналізу тэкстаў.

Якім жа чынам пашырыліся дзеепрыметнікі залежнага стану цяперашняга часу ў стараславянскай мове, калі іх пашырэнне ў праславянскай мове наўрад ці было вельмі актыўным? Натуральнай уяў-

ляецца мадэль, калі патэнцыяльная і недастаткова запатрабаваная ў праславянскай (гутарковай) мове граматычная семантыка і сродкі яе выражэння актуалізуюцца і актывізуюцца ў старaславянскай (літаратурнай) мове ў сувязі з пашырэннем яе сэнсавага і семантычнага патэнцыялу і дыскурсу. Разам з тым, разгледзім іншую версію, якая дапускае ўплыў грэцкай мовы на станаўленне і развіццё дзеепрыметнікаў залежнага стану цяперашняга часу ў старaславянскай мове і пад яе ўплывам – у шэрагу іншых славянскіх моў.

Па-першае, адзначым, што згодна са сведчаннямі Антуана Мейе, дзеепрыметнікавыя формы на *-ем-*, *-ім-* паходзяць з індаеўрапейскага медыяльнага дзеепрыметніка (г. зв., дзеепрыметніка сярэдняга стану) [Мейе 1951: 267–268]. Сярэдні, ці медыяльны стан, характэрны для праіндаеўрапейскай і некаторых індаеўрапейскіх моў, у большасці з іх на сёння знік, і дадзеная катэгорыя з'яўляецца бінарнай (залежны – незалежны стан). Шэраг форм, у тым ліку лексемаў, дзе адбылося спрошчванне асноў у выніку дээтымалагізацыі і страты граматычнасці іх былымі ўтваральнымі сродкамі, у славянскіх мовах, на думку таго ж А. Мейе, з аднаго боку, утрымліваюць элемент *-м-* у сваёй структуры як рэшткі былога дзеепрыметнікавага суфікса, з другога, маюць элементы "медыяльнай" граматычнай семантыкі, як, да прыкладу, прыметнікі тыпу *ведомъй, любимъй, лакомъй*. Таксама кампаратывіст звяртае ўвагу на блізкасць гэтых форм да падобных утварэнняў у санскрыце, грэцкай мове, лацінскай, оскска-умбрскіх гаворках, іранскіх і балтыйскіх мовах [Мейе 1951: 269]. Натуральна, маглі такія формы прысутнічаць і ў праславянскай мове, дзе, у сувязі са стратай медыяльнага кампаненту граматычнай катэгорыі дзеяслоўнага стану, яны маглі перакваліфікавацца ў "пасіўныя" формы (=формы залежнага стану). Разам з тым, прамых сведчанняў, у тым ліку, на падставе дадзеных рэканструкцый, аб пашырэнні там згаданых формаў няма.

Звяртаючыся да гістарычных фактаў, згадаем умовы і абставіны, у якіх адбылося фармаванне першай літаратурнай мовы славян, дзе і была запатрабавана больш складаная граматычная семантыка – старaславянскай мовы. Як вядома, браты Кірыла і Мяфодзь працавалі над стварэннем славянскай пісьмовасці ў Салоніках, дзе побач са славянскімі гаворкамі была распаўсюджана грэцкая мова. Насельніцтва горада, як і самі браты, былі білінгвамі. Прычым, найбольш верагоднай версіяй этнічнай прыналежнасці Салунскіх братоў з'яўляецца іх грэцкае паходжанне, хоць гэта і не даказана (як не даказана і адваротнае). Сёння, калі білінгвізм значна больш пашыраны ў розных рэгіёнах свету, прычым, нярэдка, гаворка ідзе пра паралельнае выкарыстанне вельмі розных моў, мы маем магчымасць назіраць, што ўзаемапранікненне моў адбываецца на ўсіх узроўнях, уключаючы граматычны. Улічваючы

білінгвальную свядомасць саміх стваральнікаў і пачынальнікаў старaславянскай пісьмовасці і неабходнасць перадачы складаных сэнсаў, для чаго не заўсёды меліся гатовыя лексічныя адзінкі і граматычныя мадэлі, магчыма дапусціць, што такія мадэлі (як і лексемы, тэрміны) маглі пазычацца з грэцкай мовы, якая, па-першае, служыла ў якасці эстэтычнай мадэлі (мова хрысціянскай царквы), па-другое, у пэўнай ступені роднасная славянскім (у межах індаеўрапейскай моўнай сям'і), па-трэцяе, існавала з паўднёваславянскімі мовамі ў межах адзінага арэалу, што прывяло да стварэння гэтак званага балканскага моўнага саюзу, па-чацвёртае, была адным з кампанентаў у сітуацыі білінгвізму, што склалася ў шэрагу населеных пунктаў і тэрыторый на поўначы Балканскага паўвострава. Такім чынам, згаданае паказвае на магчымасць развіцця якіх-небудзь граматычных формаў славянскай мовы (стараславянскай, а пазней пад яе ўплывам і іншых) пад уплывам грэцкай мовы. Тым больш, што гаворка не ідзе пра пазычэнне формы (цалкам адсутнай у славянскіх мовах), а хутчэй, пра абуджэнне патэнцыяльна прысутнай, але не запатрабаванай у поўнай ступені.

Адным з аргументаў за іншамоўнае паходжанне (іншамоўную стымуляцыю) формаў дзеепрыметнікаў залежнага стану цяперашняга часу з'яўляецца моцнае супраціўленне іх ужыванню, якое можам назіраць на працягу ўсёй гісторыі славянскіх моў аж да XIX стагоддзя, прычым, у большасці з іх гэтае супраціўленне прывяло да амаль поўнага знікнення. Такое непрыняцце тлумачыцца дзеяннем закона нераўнамернасці развіцця мовы, у прыватнасці, кансерватыўнасцю граматычнага ладу, які, у адрозненне ад вакабуляру (лексічнага складу) змяняецца значна павольней і значна менш. Яшчэ больш кансерватыўным моўным узроўнем з'яўляецца фанетычны лад мовы, але нават тут мы можам назіраць факты пазычэння адзінак (фанем і іх рэпрэзентантаў – гукаў), у тым ліку, на прыкладзе згаданай стараславянскай мовы і славянскіх моў і гаворак у цэлым. Прычым, гэтыя факты цалкам падобныя як па характары, так і па выніках да нашай версіі аб паходжанні дзеепрыметнікаў залежнага стану цяпершаняга часу. Гаворка ідзе пра гук [*ф*], які адсутнічаў у сістэме праславянскай мовы і быў уведзены ва ўжытак Кірылам і Мяфодзем разам з дзвюма літарамі для яго абазначэння. Дадзены факт, па-першае, паказвае на важнасць кніжных традыцый, у прыватнасці, грэцкіх кніжных традыцый для станаўлення славянскай пісьмовасці. Гук [*ф*] на працягу першых стагоддзяў славянскай пісьмовасці сустракаецца выключна ў словах ці імёнах уласных грэцкага паходжання, радзей – у іншых пазычэннях. Тым не менш, стваральнікі алфавіта ўводзяць у яго аж 2 (!) літары для абазначэння гэтага фактычна адсутнага ў мове гука. Па-другое, мы бачым магчымасць самога факта пазычэння гука і, як вынік, – фанемы

з адной мовы ў другую. Праўда, для таго, каб дадзеная фанема прыжылася, спатрэбілася амаль 1000 гадоў. Аналіз жывых беларускіх і іншых славянскіх гаворак паказвае, што нават у XX стагоддзі (і нават зараз сярод прадстаўнікоў найстарэйшых пакаленняў) дадзены гук падпадае замене на [*п*], [*хв*], радзей [*х*], што сведчыць аб яго частковым непрыняцці жывымі гаворкамі і па сёння. Сярод адукаваных слаёў насельніцтва, з другога боку, ніякіх праблем з ужываннем дадзенага гуку няма і не было ніколі, тым больш, што нягледзячы на яе першапачатковую адсутнасць у фаналагічных сістэмах славянскіх моў, адпаведная фанема вельмі добра ўпісваецца туды, набываючы здольнасць карэляцыі па звонкасці-глухасці з фанемай [*в*]. Праўда, адзначым, такая натуральная карэляцыя ўзнікла ізноў жа не ва ўсіх славянскіх мовах, напрыклад, у беларускай замест карэляцыі [*в*] – [*ф*] існуе карэляцыя [*в*] – [*ў*], хоць апошняя фанема і ўвогуле не з'яўляецца глухой. Як бачым, поўная адаптацыя фанемы ў беларускай мове так і не адбылася. Такім чынам, можна весці гаворку пра патэнцыйную (не рэальную) прысутнасць дадзенай фанемы ў славянскіх мовах у якасці сістэмнай лакуны, што актывізавалася пад уплывам грэцкай мовы, адкуль была ўведзена цалкам штучна як у выніку білінгвізму стваральнікаў славянскай пісьмовасці, так і дзеля надзвычайнай патрэбы ў перадачы амаль без скажэння грэцкай формы імёнаў святых, дзеячаў хрысціянскай царквы і гэтак далей.

З нашага пункту погляду, менавіта так магло адбывацца і пазычэнне (або абуджэнне і актывізацыя) формы дзеепрыметнікаў на *-ем-*, *-ім-* на іншым моўным узроўні, прычым крыху менш кансерватыўным, чым фанетычны лад, – на граматычным. Атавістычная форма дзеепрыметніка (рэшткі медыяльнага дзеепрыметніка праіндаеўрапейскай мовы) рэдка ўжывалася ў жывых славянскіх гаворках (праславянскай мове і мовах або гаворках, якія атрымаліся ў выніку яе дывергентнага развіцця на розных участках славянскага моўнага кантынуума). Аднак створаная Кірылам і Мяфодзем (магчыма, грэкамі паводле паходжання) пісьмовасць пад уплывам грэцкай мовы і пераважна для перакладу адпаведных грэцкіх слоў і форм на стараславянскую мову (цяжка ўявіць іншы пераклад у такім выпадку, чым паўкалька) паступова зведвае пашырэнне ўжывання згаданай формы адукаванымі і пераважна славяна-грэцкімі білінгвістычнымі носьбітамі славянскіх гаворак.

У свядомасці білінгва (білінгва – нелінгвіста!) няма выразнай мяжы паміж дзвюма мовамі: з аднаго боку, пры іх выкарыстанні дзейнічае пераключэнне кодаў, з другога, білінгв валодае пэўным арсеналам моўных выразных сродкаў дзвюх моў, якія могуць выкарыстоўвацца і пры ўжыванні той мовы, да якой дадзеныя сродкі не належаць. Гэта

адбываецца ў шэрагу выпадкаў: калі асобныя словы ці формы адной мовы ў большай ступені актывізаваныя ў свядомасці носьбіта, а ў пэўны момант наступае неабходнасць выкарыстання адпаведных сродкаў у другой мове, дзе яны актуалізаваныя недастаткова (уваходзяць у пасіўны інвентар); калі другая мова не мае адпаведных выразных сродкаў, а ўзнікае неабходнасць іх выкарыстання пры ажыццяўленні камунікатыўнага акту на гэтай мове; калі пэўныя выразныя сродкі адной мовы з'яўляюцца больш выразнымі, кампактнымі, дакладнымі і г. д., таму больш прыдатнымі да трапнага выкарыстання. Білінгв не заўсёды ўсведамляе, што дадзеныя сродкі неўласцівыя другой мове, бо для яго яны з'яўляюцца натуральным інструментам выражэння думкі. Напрыклад, у беларускай ці рускай мове няма прыказкі "Ты можаш прывесці каня да вады, але ты не можаш прымусіць яго піць", але носьбіты беларускай мовы, якія валодаюць мовай англійскай, нярэдка выкарыстоўваюць гэтую кальку "You can lead a horse to water, but you cannot make it drink".

Не менш актуальным з'яўляецца для білінгва выкарыстанне граматычных форм ці сінтаксічных канструкцый адной мовы ў другой, тым больш, што білінгвы-нелінгвісты, валодаючы дадзенымі канструкцыямі, не заўсёды могуць усведамляць іх чужароднасць адной з моў, якімі яны валодаюць: лінгвістычная свядомасць білінгва скажоная веданнем дзвюх моў. Неаднаразова даводзілася чуць на рускай мове жыхароў Гродна наступную сінтаксічную канструкцыю: «Посмотрите, или у вас нет 5 копеек». Натуральна, рускай мове такая канструкцыя неўласціва, што, аднак, не выключае магчымасці яе разумення нават за межамі Беларусі. Як бачым, у выніку лексічнай і сінтаксічнай інтэрферэнцыі адбылося змяшэнне сугучных рускіх адпаведнікаў лексемы "ці" (или – ли) і змена сінтаксічнай канструкцыі.

Такой самай магла быць і схема з'яўлення форм дзеепрыметнікаў залежнага стану цяперашняга часу з суфіксамі *-ем-*, *-ім-* у славянскіх гаворках: пад уплывам дзвюхмоўнай свядомасці білінгваў – першых стваральнікаў тэкстаў на старaславянскай мове – у працэсе іх перакладу з грэцкай мовы адбываецца граматычная інтэрферэнцыя грэцкіх словаформ са славянскімі дзеясловамі, што, да таго ж, палягчалася за кошт атавістычнай прысутнасці ў славянскіх гаворках рэшткаў былых індаеўрапейскіх медыяльных дзеепрыметнікаў для асобных слоў.

Наколькі адпавядаюць такой магчымасці факты ў граматычнай сістэме самой грэцкай мовы? Грэцкая мова ў поўнай ступені захавала трохкампанентную сістэму катэгорыі стану дзеяслова з наяўнымі пасіўным (залежным), актыўным (незалежным) і медыяльным (сярэднім) станам. Пры гэтым, дзеепрыметнікі таксама могуць мець формы ўсіх трох станаў у чатырох асноўных часах: цяперашні час, будучы час,

аорыст і перфект [Славятинская 1996: 128]. Пасіўныя і медыяльныя формы ў шэрагу выпадкаў супадаюць (аманімізм форм), як, напрыклад, у цяперашнім часе ці перфекце [Славятинская 1996: 128]:

| | Пасіўны (залежны) стан | Медыяльны стан |
|---|---|---|
| Цяперашні час | Παιδευόμενος | παιδευόμενος |
| Перфект | Πεπαιδευμένος | πεπαιδευμένος |

Пасіўная форма будучага часу ўтвараецца ад медыяльнай з выкарыстаннем суфікса *-θη-* – *παιδευθησόμενος*, у форме аорыста пасіўная і медыяльная формы таксама не супадаюць (*παιδευσάμενος* – *παιδευθείς*). Фактычна, форма, што цікавіць нас, гэта адзіная медыяльна-пасіўная форма цяперашняга часу, якая да таго ж можа мець як медыяльныя і пасіўныя, так нават і актыўныя значэнні [Славятинская 1996: 121]. Паводле граматычнай семантыкі дадзеная форма з'яўляецца блізкай да разгляданых у гэтым артыкуле форм славянскіх дзеепрыметнікаў залежнага стану цяперашняга часу, дзе, аднак, катэгорыя стану рэалізавана ў рэдукаваным выглядзе ў параўнанні з грэцкай і іншымі індаеўрапейскімі мовамі, у якіх залежны (а дзе ёсць – і медыяльны) стан ужываецца значна больш рэгулярна, чым у славянскіх (гэта тычыцца не толькі дзеепрыметнікаў, але і іншых дзяслоўных форм). Дадамо, што рэдукаванасць катэгорыі стану за кошт меншай ужывальнасці залежнага стану і "другаснасць", некаторая штучнасць залежнага стану выяўляюцца і ў тым факце, што фактычна па-за межамі сістэмы дзеепрыметнікаў спецыфічных сродкаў выражэння стану і няма (зваротныя дзеясловы, акрамя таго, што могуць выконваць функцыю залежнага стану, маюць і іншую семантычную нагрузку і не з'яўляюцца, такім чынам, спецыфічным сродкам).

Прыведзеныя прыклады, як бачым, утрымліваюць у сваёй структуры суфікс *-μεν-*, які мае гукавы кампанент *-μ-*. Пры гэтым праславянскі фармант дзеепрыметніка залежнага стану цяперашняга часу быў **-mno* [Мейе 1951: 269], што сведчыць пра роднаснасць – агульнае паходжанне – праславянскіх і грэцкай форм і магчымасць іх далейшага ўзаемаўплыву ў працэсе апісаных вышэй моўных кантактаў. Разгляданыя формы паходзяць ад адпаведных праіндаеўрапейскіх форм, але пры іх развіцці ў грэцкіх і славянскіх гаворках яны мелі розны лёс. Калі ў грэцкай мове – да IX стагоддзя нашай эры яна ў больш чым поўнай ступені самарэалізавалася як літаратурная мова – такія формы былі надта пашыраны, дзякуючы запатрабаванасці адпаведнай граматычнай семантыкі, то ў славянскіх гаворках формы існавалі ў атавістычным выглядзе і не набылі шырокага распаўсюджання. Другой прычынай для частковай дэактывізацыі форм з'явілася перабудова катэрыі стану ў славянскіх мовах увогуле, што выявілася як у знікненні

граммемы медыяльнага стану і набыцці катэгорыяй бінарнага характару, так і да фактычнага звядзення дадзенай катэгорыі да дзеепрыметнікавых форм [Горшкова 1981: 283], а таксама з пераважным выкарыстаннем ў залежным стане дзеепрыметнікаў прошлага часу, што абумоўлена іх сувяззю "з дзеясловамі закончанага трывання <...> і спецыфікай семантыкі, якая ў іх рэалізавана".

Прычым, у тых славянскіх мовах, якія засноўваліся непасрэдна на адпаведных славянскіх гаворках і без значнага ўплыву з боку старажытнаславянскай і праз яе грэцкай моў, у тым ліку часта пад уплывам раманскіх ці германскіх моў, працэс дэактывізацыі форм на *-ем-*, *-ім-* дзеепрыметнікаў залежнага стану цяперашняга часу працягваўся, што прывяло да іх канчатковага заняпаду або поўнага знікнення (асабліва гаворка ідзе пра заходнеславянскія мовы). Гэта назіраем, дарэчы, і ў беларускай мове, дзе на канец XIX, ды і ў пачатку XX стагоддзя ўжыванне дадзеных дзеепрыметнікаў было мінімізавана, хоць у дадзеным выпадку поўная дэактуалізацыя формы так і не адбылася, паколькі ўсё ж старaславянская мова на тэрыторыі Беларусі выкарыстоўвалася досыць актыўна ў розныя гістарычныя перыяды, а ў XIX стагоддзі пашыраецца і ўплыў рускай мовы. Апошняга, аднак, было недастаткова для паўнавартаснага пранікнення формы ў гутарковую мову, а таксама і ў літаратурную на першых этапах яе развіцця. Разам з тым, пры пашырэнні русіфікацыі згаданы ўплыў пашырыўся, і дзеепрыметнікі залежнага стану цяперашняга часу пачынаюць актыўна пранікаць у кніжныя стылі беларускай мовы, пры гэтым застаючыся дастаткова чужымі для жывой гутарковай мовы. У канцы XX – пачатку XXI стагоддзя гэтыя формы знаходзяцца на перыферыі лінгвістычнага супрацьстаяння сярод навукоўцаў і моўнікаў з пурыстычнымі поглядамі і тых, хто актыўна прасоўвае разгляданыя формы ва ўжытак.

Як вынік, адносная храналогія развіцця дзеепрыметнікаў залежнага стану цяперашняга часу з суфіксамі *-ем-*, *-ім-*, *-ом-* можа выглядаць наступным чынам:

1. праіндаеўрапейскі медыяльны дзеепрыметнік на **-mno*;
2. а) яго развіццё ў грэцкай мове, фармант набывае форму *-μεν-*;
   б) перабудова катэгорыі стану, страта медыяльнага значэння, набыццё дадзенай формай значэння залежнага стану і паступовая дэактывізацыя яе ў славянскіх гаворках;
3. актывізацыя разгляданай формы падчас стварэння славянскай пісьмовасці пад уплывам грэцкай мовы ў выніку моўнай інтэрферэнцыі і пераважна перакладнога характару большасці тэкстаў, дзе такія дзеепрыметнікі ўжываюцца;
4. а) далейшае затуханне дадзенай формы ў жывых гаворках, у тым ліку, беларускіх, да поўнага знікнення ў некаторых славянскіх мовах;

б) далейшае пашырэнне формы ў кніжных стылях, у тым ліку, у рускай мове, а таксама, пад яе ўплывам, у некаторых варыянтах сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

У наш час дзеепрыметнікі залежнага стану цяперашняга часу ўсё яшчэ застаюцца дыскусійнай катэгорыяй, якая цалкам натуральна ўспрымаецца аднымі моўнікамі і цалкам адвяргаецца іншымі. Відавочна, тым не менш, што разгляданая форма ў беларускай мове мае досыць спецыфічнае паходжанне і стымулюецца не столькі патрэбамі ў перадачы адпаведнай граматычнай семантыкі, колькі ў патрэбе знаходжання эквівалентаў адпаведным рускім структурам. Пры гэтым, як мы паспрабавалі давесці ў гэтым артыкуле, і ў рускай мове такія дзеепрыметнікі цалкам могуць мець штучнае і іншамоўнае паходжанне, што і тлумачыць праблемнасць іх ужывання ў славянскіх мовах увогуле.

## Бібліяграфія

Bagdzevìč A.Ì. 2000. *Slovaŭtvaral'naâ struktura addzeâsloŭnyh tèrmìnaadzìnak u sučasnajbelaruskaj move*. Grodna: GrDU [Багдзевіч А.І. 2000. *Словаўтваральная структура аддзеяслоўных тэрмінаадзінак у сучаснай беларускай мове*. Гродна: ГрДУ].

Dankov V.N. 1981. *Istoričeskaâ grammatika russkogo âzyka. Vyraženie zalogovyh otnošenij u glagola*. Moskva: Vysšaâ škola [Данков В.Н. 1981. *Историческая грамматика русского языка. Выражение залоговых отношений у глагола*. Москва: Высшая школа].

Gorškova K.V., Haburgaev G.A. 1981. *Istoričeskaâ grammatika russkogo âzyka*. Moskva: Vysšaâ škola [Горшкова К.В., Хабургаев Г.А. 1981. *Историческая грамматика русского языка*. Москва: Высшая школа].

Macûsovič Â.V. 1976. *Morfologičeskij stroj sovremennogo pol'skogo literaturnogo âzyka*. Leningrad: LGU [Мацюсович Я.В. 1976. *Морфологический строй современного польского литературного языка*. Ленинград: ЛГУ].

Meje A. 1951. *Obŝeslavânskij âzyk*. Moskva: Izd. Inostrannoj literatury [Мейе А. 1951. *Общеславянский язык*. Москва: Изд. Иностранной литературы].

Mistrik J., Tuguševa R. 1981. *Učebnik slovackogo âzyka*. Moskva: Vysšaâ škola [Мистрик Й., Тугушева Р. 1981. *Учебник словацкого языка*. Москва: Высшая школа].

Scâcko P.V. 2002. *Kul'tura movy*. Mìnsk: Tèhnalogìâ [Сцяцко П.В. 2002. *Культура мовы*. Мінск: Тэхналогія].

Širokova A. 1952. *Očerk grammatiki češskogo âzyka*. Moskva: Izd. literatury na inostrannyh âzykah [Широкова А. 1952. *Очерк грамматики чешского языка*. Москва: Изд. литературы на иностранных языках].

Slavâtinskaâ M.N. 2003. *Učebnik drevnegrečeskogo âzyka*. V 2-h č. Č 2. Moskva: Filologiâ [Славятинская М.Н. 1996. *Учебник древнегреческого языка*. В 2-х ч. Ч. 2. Москва: Филология].

Suprun A.E. 1993. *Praslavânskij âzyk*. Minsk: Universitetskoe [Супрун А.Е. 1993. *Праславянский язык*. Минск: Университетское].

**ABSTRACT**: The passive participles of the present tense have been actively used only in Russian out of all Slavic languages since the 19th century and are a grammatical

category that is not accepted by all native speakers of the standard Belarusian language as a normative one. During the development of Slavic languages, it has been experiencing two opposite tendencies: decline and revival. The article examines extralinguistic and intralinguistic factors that could have influenced the development of this verb form in a number of Slavic languages. According to the author, the bilingual Slavic-Greek consciousness of the creators of Slavic writing could have influenced the strengthening of these forms in the Russian language. The article analyzes possible connections of the Slavic participles of the present tense with the medial and passive participles of the Greek language in the light of their common origin from the Indo-European participle, as well as the process of development of participles during the restructuring of the voice category and in connection with the development of the aspect category.

**KEYWORDS**: participle, category of voice, Slavic languages, passive voice, Indo-European languages, Proto-Slavic language, Russian language, Belarusian language.

**STRESZCZENIE:** Imiesłowy bierne czasu teraźniejszego, które ze wszystkich języków słowiańskich były aktywnie używane tylko w języku rosyjskim od XIX wieku i są kategorią gramatyczną, która nie jest akceptowana przez wszystkich rodzimych użytkowników białoruskiego języka literackiego jako normatywna, doświadczają dwóch przeciwstawnych tendencji w rozwoju języków słowiańskich: schyłku i odrodzenia. W artykule omówiono czynniki pozajęzykowe i intralingwistyczne, które mogły wpłynąć na rozwój tej formy imiesłowa w wielu językach słowiańskich. Zdaniem autora dwujęzyczna świadomość słowiańsko-grecka twórców pisma słowiańskiego mogła wpłynąć na utrwalenie form w języku rosyjskim. Możliwe związki imiesłowów słowiańskich czasu teraźniejszego z imiesłowami przyśrodkowymi i biernymi języka greckiego w świetle ich wspólnego pochodzenia z imiesłowu indoeuropejskiego, procesu rozwoju imiesłowów podczas przekształcenia kategorii strony i w związku z rozwojem kategorii aspektu są analizowane w niniejszej publikacji.

**SŁOWA KLUCZOWE:** Imiesłów przymiotnikowy, Imiesłów przymiotnikowy bierny, języki słowiańskie, kategoria strony, języki indoeuropejskie, język prasłowiański, język rosyjski, język białoruski.

**РЭЗЮМЭ**: Дзеепрыметнікі залежнага стану цяперашняга часу, якія з усіх славянскіх моў актыўны ўжытак знайшлі толькі ў рускай мове з XIX стагоддзя і з'яўляюцца граматычнай катэгорыяй, якая прымаецца не ўсімі носьбітамі беларускай літаратурнай мовы як нарматыўная, на працягу развіцця славянскіх моў зведваюць дзве супрацьлеглыя тэндэнцыі: заняпад і актывізацыю. У артыкуле разглядаюцца экстралінгвістычныя і інтралінгвістычныя фактары, што маглі паўплываць на развіццё дадзенай дзеяслоўнай формы ў шэрагу славянскіх моў. На думку аўтара, актывізацыя форм у рускай мове магла адбывацца пад уплывам білінгвальнай славяна-грэцкай свядомасці стваральнікаў славянскай пісьмовасці. Аналізуюцца магчымыя сувязі славянскіх дзеепрыметнікаў залежнага стану цяперашняга часу з медыяльнымі і пасіўнымі дзеепрыметнікамі грэцкай мовы ў святле іх агульнага паходжання з індаеўрапейскага дзеепрыметніка, разглядаецца працэс развіцця

дзеепрыметнікаў у ходзе перабудовы катэгорыі стану славянскіх дзеепрыметнікаў і ў сувязі з развіццём катэгорыі трывання.

**Ключавыя словы**: дзеепрыметнік, залежны стан, славянскія мовы, катэгорыя стану, індаеўрапейскія мовы, праславянская мова, руская мова, беларуская мова.

*Data przesłania artykułu: 1.11.2021*
*Data akceptacji artykułu: 12.12.2021*

## ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

**Anatol Bahdzevich / Анатоль Багдзевіч** – Białoruś, Grodzieński Uniwersytet Państwowy im. Janki Kupały, Katedra Filologii Angielskiej; doktor nauk filologicznych, docent; specjalność naukowa: językoznawstwo, język białoruski; zainteresowania naukowe: słowotwórstwo, język nagłówków, powiązania międzyjęzykowe.

**Adres**: Кафедра англійскай філалогіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, вул. Ажэшкі 22, 230023 Гродна, Беларусь.

**Выбраныя публікацыі (2020–2021):**

1. Багдзевіч А.І. 2020. *Структура газетнага загалоўка як стылеўтваральны фактар* (30–35). У: *Актуальныя праблемы мовазнаўства: зборнік навуковых артыкулаў (да 90-годдзя прафесара Паўла Уладзіміравіча Сцяцко)*. Гродна: ЮрСаПрынт.